справай Сірыі стварыць службы, якія будуць ажыццяўляць распрацоўку нацыянальных стандартаў. Наяўнасць стандартызацыі ў Сірыі дасць магчымасць ажыццявіць цэнтралізаваную каталагізацыю, што стане гарантам павышэння якасці і эфектыўнасці выкарыстання каталогаў спажыўцамі інфармацыі.

**Я.Л.Мархоцкі**, *прафесар*
**А.В.Палянская**, *дацэнт*

## УДАСКАНАЛЕННЕ НАВУЧАЛЬНАГА ПРАЦЭСУ Ў СІСТЭМЕ СТАНДАРТАЎ ВЫШЭЙШАЙ КУЛЬТУРАЛАГІЧНАЙ І МАСТАЦКАЙ АДУКАЦЫІ
(курс "Асновы экалогіі")

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З мэтай забеспячэння спрыяльных для існавання сучасных і будучых пакаленняў умоў дзяржава ставіць перад вышэйшай школай новыя задачы ў галінах экалагічнай адукацыі, выхавання студэнтаў. Адным з накірункаў у гэтай справе з'яўляецца ўдасканаленне методыкі выкладання курса "Асновы экалогіі" паводле стандартаў вышэйшай гуманітарнай адукацыі.

Выпрацоўка грамадзянскага стаўлення да навакольнай прыроды цесна звязана з фарміраваннем не толькі сістэмы ведаў, але і ўменняў, навыкаў арыентацыі ў навакольным асяроддзі. Метадалагічнай асновай авалодання сучаснымі экалагічнымі ведамі з'яўляецца дыялектычнае адзінства ў сістэме "чалавек — грамадства — прырода". Гэтыя веды павінны мець міжпрадметны характар, уключаць у сябе прыродазнаўча-навуковыя, грамадска-гістарычныя, сацыяльна-эканамічныя, тэхніка-тэхналагічныя, маральна-эстэтычныя сістэмы ўзаемадзеяння грамадства з прыродай.

У сучаснай навуцы паняцце экалогіі не трэба абмяжоўваць толькі біялагічным яго значэннем. Яно павінна характарызавацца адзінствам сацыяльных, эканамічных,

тэхналагічных, гігіенічных фактараў жыцця людзей, што разам з экалогіяй прыродных сістэм утвараюць сучасную комплексную экалогію. Вывучэнне апошняй дапаможа выпрацаваць агульную стратэгію паводзін у прыродзе.

Праграма курса "Асновы экалогіі" для неспецыяльных факультэтаў ВНУ ўключае 26 гадзін лекцый і 10 гадзін семінарскіх заняткаў. Яна зацверджана Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь 20 студзеня 1997 г. за № ТД — 44/ТЫП.

Асноўны прынцып прапанаванай методыкі выкладання гэтага курса заключаецца ў комплексным падыходзе да раскрыцця ўзаемасувязей паміж грамадствам і прыродай. Пры выкладанні павінны разглядацца сістэмы рознага ўзроўню складанасці, структура іх, узаемасувязі, змяненні сістэм пад уплывам розных відаў прыроднага і антрапагеннага ўздзеяння. Сучасная экалогія ўяўляе аснову рацыянальнага прыродакарыстання, аховы прыроды. У цэлым курс павінен садзейнічаць развіццю ў студэнтаў экалагічнага мыслення.

Знаёмства з курсам пачынаецца з атрымання ведаў па біясферы, яе будове, уласцівасцях, уздзеянні чалавека на біясферу. Пазней вывучаюцца экалагічныя фактары, прыродныя і прыродна-сацыяльна-гаспадарчыя сістэмы. Раздзелы "Чалавецтва і экалагічная раўнавага", "Гаспадарчая дзейнасць чалавека і навакольнае асяроддзе" раскрываюць асноўныя формы ўзаемадзеяння грамадства і прыроды, спосабы рацыянальнага выкарыстання прыродных сістэм, асобных кампанентаў прыроды, уплыў, які аказваюць віды гаспадарання на навакольнае асяроддзе.

Значная роля адводзіцца знаёмству з раздзеламі, прысвечанымі экалагічным праблемам чалавецтва, глабальным экалагічным пытанням, уплыву на здароўе чалавека экалагічных фактараў.

Галоўнымі задачамі экалагічнай адукацыі ў сістэме стандартаў вышэйшай культуралагічнай і мастацкай накіраванасці з'яўляюцца:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

— выпрацоўка ў студэнтаў цэласнага ўяўлення аб навакольным асяроддзі як аб сферы актыўнага ўзаемадзеяння чалавека і прыроды, прывіццё ім трывалых ведаў законаў развіцця прыроды, грамадства;

— узбраенне будучых работнікаў культуры, мастацтва эфектыўнымі метадамі выкарыстання прыродных рэсурсаў, ведамі ацэнкі ўплыву гаспадарчага ўздзеяння на якасць прыроднага асяроддзя, здароўе чалавека;

— выпрацоўка комплекснага падыходу да ацэнкі навакольнага асяроддзя з улікам экалагічных, сацыяльных, эканамічных, тэхналагічных, прававых, культурных, эстэтычных аспектаў.

З мэтай больш глыбокага вывучэння матэрыялу курса "Асновы экалогіі" студэнтам даецца самастойная работа па адной з глабальных экалагічных праблем сучаснасці, па якой тыя пішуць рэферат: змяненне клімату; станчэнне азонавага слоя; недахоп пітных вод; забруджванне падземных вод; уплыў пестыцыдаў на здароўе насельніцтва; кіслотныя дажджы; знішчэнне таксічных адходаў і інш. Пасля праверкі рэфератаў з найбольш цікавымі з іх студэнты выступаюць на семінарскіх занятках. У форме актыўнай дыскусіі пры дапамозе выкладчыка яны авалодваюць ведамі па асноўных раздзелах экалагічнай навукі.

Як абагульняючыя заняткі рэкамендуецца гульня "Экалогія і мы". Падчас яе правядзення абмяркоўваецца шэраг пытанняў: асноўныя законы, правілы экалогіі; паводзіны ў прыродзе; экалогія горада, побыту і інш. Пры гэтым кожнае пытанне мае шмат цікавых аспектаў, ведаць якія асабліва неабходна работніку культуры.

Вельмі карысныя, лічым, былі б занятк і ў форме экскурсій на гарадскую ачышчальную водаправодную станцыю, да збудаванняў па ачышчэнні прамысловых, гаспадарча-бытавых, камунальных сцёкавых вод. Яны дазволілі б студэнтам пазнаёміцца з ацэнкамі якасці вады паводле арганалептычных, хімічных, бактэрыялагічных паказчыкаў, дазнацца аб тым, колькі вады патрабуецца на чалавека ў

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКИ

суткі, чаму трэба берагчы ад забруджвання пітную ваду, асабліва з адкрытых вадаёмаў і падземных крыніц.

Атрыманыя веды будуць спрыяць пашырэнню кругагляду, павышэнню прафесійнага ўзроўню будучых спецыялістаў культуры і мастацтва.

**Р.С.Матульскі,** *дацэнт*

## НАРМАТЫЎНА-ПРАВАВАЯ БАЗА СТАНДАРТЫЗАЦЫІ БІБЛІЯТЭЧНА-ІНФАРМАЦЫЙНАЙ АДУКАЦЫІ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

У наш час без стандартызацыі, г.зн. дзейнасці, накіраванай на дасягненне аптымальнай ступені ўпарадкавання ў пэўнай галіне шляхам устанаўлення палажэнняў для ўсеагульнага і шматразовага прымянення ў адносінах рэальных або патэнцыяльных задач, немагчымыя ні інтэграцыя з сумежнымі галінамі вытворчасці ці навукі, ні плённае супрацоўніцтва з замежнымі партнёрамі, забеспячэнне канкурэнтаздольнасці тавараў і паслуг.

Таму зусім не дзіўна, што цяпер на першы план выходзіць праблема праектавання адукацыйных сістэм у кантэксце вызначэння нормы "ідэальнага тыпу", таго, што называюць "адукацыйным стандартам".

Спецыялістамі адукацыйны стандарт вызначаецца як "сукупнасць канкрэтных патрабаванняў, г.зн. апісанне адпаведных ведаў, уменняў і навыкаў, таго мінімуму, які дазваляе даволі аб'ектыўна сертыфікаваць узровень і якасць падрыхтоўкі студэнтаў па пэўнай дысцыпліне" (Адукацыя і выхаванне. — 1996. — № 6. — С.41). Ёсць і больш агульныя азначэнні. Адукацыйны стандарт разумеецца як "дакумент, што вызначае абавязковыя мінімальна дапушчальныя патрабаванні да арганізацыі, працэсу і вынікаў адукацыйнай дзейнасці, які дазволіць выпускніку вышэйшай навучальнай установы паспяхова выконваць